# Смачна есці!



**Па гарызанталі:** **2.** «Я ем, каб жыць, другія ... жывуць, каб есці». Сакрат. **5.** Тое, што і экзотыка. **10.** Жанр лірычных мініяцюр у беларускай прозе. **12.** Дакумент на выкананне якой-небудзь работы. **14.** Блін не клін, ... не расколе (прык.). **15.** Дзе бацвінне і каша, там і ... наша (прык.). **17.** Сукупнасць усіх відаў раслін якой-небудзь мясцовасці. **19.** Самагонка, як дурная ...; ці з розуму звядзе, ці сілу скрадзе (прык.). **23.** Тое, што і раніца. **24.** Беларуская страва накшталт клёцак з таркаванай бульбяной масы. **26.** Штучнае абвадненне зямель. **27.** «Найперш дала яна капусту,//Тады са скваркамі кулеш,//На малацэ крупеню густу». З паэмы «... на Парнасе».

**Па вертыкалі:** **1.** Загадчык гаспадаркі. **3.** Слізганне колаў, якія перасталі круціцца. **4.** «У старасці той самы апетыт, як у маладосці, толькі ... не тыя». М. Самазванец. **6.** Французская дыета: раніцай ..., увечары секс (прык.). **7.** Ад дрэннай гаспадыні нават ... ўцякае (прык.). **8.** «Была ў іх гушча і драчона//І смажона». З паэмы «Энеіда навыварат». **9.** «Слухаць музыку ў ... яды — крыўда для повара і для скрыпача». Г. Чэстэртон. **11.** Націнне бульбы. **13.** Тое, што і дранка. **14.** Тэатральны служачы, адказны за бутафорыю. **16.** Беларуская блюда з мясного фаршу, з рысам. **18.** ... — лепшы повар (французская прык.). **20.** Камякі з тоўчанай бульбы (абл.). **21.** «Лепш ранае яйка ў мірную пару, чым смажаны ... у вайну». Л.Фейхтвангер. **22.** Ежа з дробна пасечанай агароднiны, грыбоў. **25.** Чацвёртая нота музычнай гамы.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** 2. Людзі. 5. Экзатызм. 10. Абразкі. 12. Нарад. 14. Бруха. 15. Месца. 17. Флора. 19. Жонка. 23. Ранне. 24. Капыткі. 26. Ірыгацыя. 27. Тарас.

**Па вертыкалі:** 1. Эканом. 3. Юз. 4. Зубы. 6. Кекс. 7. Малако. 8. Парасяціна. 9. Час. 11. Бульбоўнік. 13. Драніца. 14. Бутафор. 16. «Вожыкі». 18. Апетыт. 20. Камы. 21. Бык. 22. Ікра. 25. Фа.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.37 | 21.46 | 17.09 |
| Віцебск — | 4.18 | 21.44 | 17.26 |
| Магілёў — | 4.27 | 21.36 | 17.09 |
| Гомель — | 4.33 | 21.23 | 16.50 |
| Гродна — | 4.54 | 21.59 | 17.05 |
| Брэст — | 5.04 | 21.50 | 16.46 |

**Месяц**

*Поўня 20.06–26.06.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

**Імяніны**

***Пр.** Васіля, Канстанціна, Фёдара, Яфрэма.*
***К.** Аліцыі, Марты, Алоіза, Рудольфа, Тодара.*

## ЗАЎТРА



Фота Аляксандра АСІПЕНКІ.




**Даты Падзеі Людзі**

**21 чэрвеня**




**1741** год — 275 гадоў таму нарадзіўся Жан Эмануэль Жылібер, французскі і беларускі натураліст, хірург і анатам, доктар медыцыны (1763). У 1775—1781 гадах арганізаваў і кіраваў першай у Беларусі Гродзенскай медыцынскай акадэміяй. Заснаваў таксама акушэрскую і ветэрынарную школы, клінічны шпіталь, батанічны сад у Гродне. Аўтар прац па флоры Беларусі, Літвы, Польшчы, па эпідэміялогіі эндэмічных хвароб у гэтых краінах. Памёр у 1814 годзе.

**1905** год — нарадзіўся Жан-Поль Сартр, французскі філосаф, пісьменнік, драматург і эсэіст. Прызнаны лідар экзістэнцыялісцкага руху, Сартр стаў найбольш заўважным і абмяркоўваемым аўтарам у пасляваенай Францыі. Разам з Сімонай дэ Бавуар і Марысам Мярло-Панці ён заснаваў часопіс «Новыя часы». Пачынаючы з 1947 года Сартр рэгулярна публікаваў асобныя тамы сваіх публіцыстычных і літаратурна-крытычных нарысаў пад назвай «Сітуацыі». У 1950-я гады супрацоўнічаў з Французскай камуністычнай партыяй. Выступаў з асуджэннем савецкага ўварвання ў Венгрыю ў 1956 годзе і Чэхаславакію ў 1968 годзе. У пачатку 1970-х гадоў паслядоўны радыкалізм Сартра выявіўся ў тым, што ён стаў рэдактарам забароненай у Францыі мааісцкай газеты. У 1964 годзе Сартр адмовіўся ад Нобелеўскай прэміі па літаратуры, заявіўшы, што не хацеў бы ставіць пад сумненне сваю незалежнасць. Памёр у Парыжы 15 красавіка 1980 года.

**1951** год — 65 гадоў з дня нараджэння (вёска Сугакі Ваўкавыскага раёна) Віталя Віталевіча Лапы, беларускага вучонага ў галіне аграхіміі, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара, акадэміка НАН Беларусі. У 1972 годзе скончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут. Аўтар больш чым 500 навуковых прац па пытаннях мінеральнага харчавання раслін, павышэння ўраджайнасці глеб, аграхімічнага забеспячэння сельскагаспадарчай вытворчасці. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**Было сказана**

**Анатоль АСТРЭЙКА, паэт:**
*«Зямля ніколі смутак не раджала*
*І за дабро плаціла нам дабром».*

## ■ Ну і ну!

### ЗДАБЫВАЛІ Ў ПАМЕЖНАЙ ЗОНЕ... БУРШТЫН

**Работнікі Пінскай міжраённай інспекцыі сумесна з вайскоўцамі Пінскага пагранатрада ў памежнай зоне паблізу вёскі Жолкіна Пінскага раёна затрымалі чатырох жыхароў, якія спрабавалі здабыць... бурштын.**

— Затрыманыя чулі, што непадалёк, на тэрыторыі Украіны, вядзецца здабыча бурштыну, і таксама захацелі паспрабаваць свайго шчасця. З бліжэйшага вадаёма пампавалі ваду і вымывалі ў зямлі лункі дыяметрам да паўтара і глыбінёй да чатырох метраў. Усяго паспелі вымыць 15 такіх лунак, і гэтага хапіла, каб прычыніць навакольнаму асяроддзю значную шкоду, якая зараз падлічваецца, — паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. — Гэты выпадак — не першы ў краіне. Падобны факт быў летась у Драгічынскім раёне.

Бурштын парушальнікі так і не знайшлі. Аднак знаходлівасць і сквапнасць гэтых людзей не могуць не здзівіць: яны адначасова незаконна нарыхтоўвалі драўніну непадалёк. Да моманту затрымання імі было ссечана больш за сто дрэў розных парод.

### НЕЛЕГАЛЬНА ЎВЁЗ ТЫСЯЧУ ЛІТРАЎ СПІРТНОГА

**У сталіцы выяўлены факт незаконнай перавозкі спіртаўтрымліваючай вадкасці грамадзянінам Расіі.**

Паводле інфармацыі Кастрычніцкага РУУС г. Мінска, у салоне мінівэна (дарэчы, з узмоцненай задняй базай падвескі), якім кіраваў 30-гадовы жыхар суседняй краіны, знаходзіліся пяцілітровыя каністры са спіртаўтрымліваючай вадкасцю. Міліцыянеры знайшлі яе тысячу літраў коштам 60 мільёнаў рублёў. Груз расіянін нелегальна ўвёз на тэрыторыю нашай краіны з Пскоўскай вобласці. На спіртное адсутнічалі дакументы, груз не быў прамаркіраваны ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку. Пастановай суда Кастрычніцкага раёна сталіцы на вінаватую асобу накладзены штраф, каністры са змесцівам звернутыя ў даход дзяржавы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*




*Віншуем нашу матулю і бабулю*
***Вольгу Канстанцінаўну РЫЖЭВІЧ** з вёскі Заберазь Іўеўскага раёна з 85-годдзем. Жадаем ёй моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця. А жыццё ў яе было цяжкае. Рана застаўшыся без мужа, яна адна вырасціла двух сыноў і дачку, замяніла пляменніцы яе маці, якая рана пайшла з жыцця, усім дапамагла атрымаць адукацыю. Зараз у яе восем унукаў, шэсць праўнукаў, нас многа. А яна ў нас адна, і мы спадзяёмся яшчэ доўга прыязджаць у нашу вёску і бачыць агеньчык у нашай не пустой роднай хаце.*


## УСМІХНЕМСЯ

**Не пытайцеся мяне, ці бачыў я які-небудзь новы фільм. У мяне чатыры маленькія дачкі. Калі там няма прынцэс, якія спяваюць, адказ — не.**

— Чым заняты?
— Пасьянс раскладваю.
— Камп'ютар завёў?
— Ды не, шкарпэткі за тыдзень памыў.

**Ніколі не задавайце дзяўчатам пытанне «Чаму?».**
**...Адказ відавочны: «Таму што!»**

Размаўляюць сяброўкі:
— Як ты думаеш, якая лепшая адмова ад сексу?
— «Даражэнькі, прабач, але ў мяне сёння ўжо быў секс».

**Адзінокая футбольная каманда жадае пазнаёміцца з алігархам сваёй мары.**

— Любы, так хочацца чагосьці цёплага, светлага...
— Піва будзеш?

**Бізнес-план:**
**1. Папрасіць у мужа грошай!**




Малюнак Уладзіміра ЧУГЛАЗАВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 2427.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 20 чэрвеня 2016 года.